*А.І.Смолік*
(Мінск)

# Вернасць Радзіме і мастацтву

У радаводзе Тышкевічаў адметнай асобай з’яўляецца граф Бенядыкт Тышкевіч (1852–1935), які нарадзіўся ў мястэчку Немеж, а меў маёнткі ў Налібоцкай пушчы. Ён увайшоў у гісторыю беларускай і сусветнай мастацкай культуры як выдатны фотамастак канца XIX ст., прызнаны майстар, які адзін з першых накіраваў аб’ектыў фотакамеры на жыхароў сваіх шматлікіх маёнткаў і іх побыт. Калекцыя фотаздымкаў, зробленых у Беларусі, захоўваецца ў Музеі фатаграфіі Нісэфора Ньепса горада Шалон-на-Соне (Францыя). Захавальнік музея Крыстэль Рашэт мяркуе, што гэтая калекцыя – адна з дзвюх існуючых у свеце калекцый фотаздымкаў графа Тышкевіча. Адна з іх знаходзіцца ў Варшаве, а другая – у музеі Ньепса ў Францыі.

На пытанне журналістаў аб тым, як трапілі фотаздымкі Тышкевіча ў музей Нісэфора Ньепса, спадарыня Рашэт адказала, што калекцыю прапанаваў музею адзін з парыжскіх антыквараў. “Хутчэй за ўсё, першапачаткова калекцыя ўяўляла сабой альбом з фотаздымкамі”, – адзначыла яна. Калекцыя была падаравана музею Таварыствам сяброў музея Нісэфора Ньепса, якое ў сваю чаргу набыло яе ў 1993 годзе ў антыквара з парыжскага квартала Сен-Уана пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры Францыі. 86 арыгіналаў фотаздымкаў графа Бенядыкта і выстаўляліся толькі аднойчы ў Францыі ў 1994 г. Копіі высокай якасці экспанаваліся таксама ў Вільні ў 2000 г. Пры жыцці Бенядыкт Тышкевіч экспанаваў свае лепшыя фотаздымкі на выставе ў Філадэльфіі ў 1876 г.

Пераважна гэтыя здымкі зроблены ў беларускай вёсцы Вялава, што ў Налібоцкай пушчы. Там знаходзіўся загарадны паляўнічы дом, у якім граф у 1893 г. пабудаваў

фоталабараторыю і здымачны павільён. Дом гэты быў разбураны немцамі падчас Другой сусветнай вайны, тады ж загінулі і фотаархівы графа, і цудоўнейшая калекцыя твораў мастацтва, але рэшткі гэтай пабудовы захаваліся досыць добра і па сённяшні дзень. Фатаграфіі местачкоўцаў, інтэр’еры вясковых хат, модныя будуары, салоны, вялікая колькасць партрэтаў сучаснікаў, у якіх максімальна выявіўся мадэрнізм і рамантызм творцы. У залежнасці ад тэмы фотаздымку фатографы таго часу падбіралі дэкарацыі. Імітацыя неба, часам з элементамі архітэктуры на далёкім плане; каб падкрэсліць прастору, маляваліся галінкі дрэў. Потым умацоўваліся натуральныя галінкі, якімі аздабляўся пярэдні план жывапіснага фону. Часам, каб дасягнуць найбольшай выразнасці ў выявах, першы план падлогі пасыпаўся пяском або лісцем.

Бенядыкт Тышкевіч, адзін з багацейшых арыстакратаў, знаходзіў радасць не толькі ў балях і раскошы сядзіб, але і ў археалогіі, і ў фатаграфіі. Ён арандаваў караблі, каб ездзіць у экспедыцыі, аб’ехаў Індыю, Кітай, Японію. Аднойчы здзейсніў падарожжа вакол свету на яхце. З таго часу да яго прыходзіць сусветная слава фатографа-падарожніка. У пэўным сэнсе Бенядыкт Тышкевіч становіцца фотарэпарцёрам свайго часу. Нічога не выпадала з-пад яго ўважлівага позірку, а дасканаласць фотаздымкаў сведчыць аб высокім прафесійным узроўні майстра.

У 1883 г., пасля смерці жонкі, граф з трыма дзецьмі выехаў у Францыю, дзе стала пражываў у сваёй сядзібе ў Нёі. Памёр у 1935 г. і пахаваны ў Ніцы ў сямейным пантэоне, побач з маці.

За адсутнасцю фотаархіва імя Тышкевіча-фатографа амаль невядома на Радзіме. Яго пачалі забываць, нягледзячы на тое, што свой родны край ён адлюстраваў на шматлікіх здымках. Сярод іх як твор мастацтва вылучаецца партрэт яго дачкі Эльжбеты Тышкевіч (1882–1969).

Сёння граф – фатограф і вандроўнік, які так доўга быў далёка ад Радзімы, вярнуўся да нас разам са сваімі цудам

выратаванымі творамі, якія экспанаваліся пэўны час у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у 2009 г. Арганізатарамі выстаўкі, прысвечанай 170-годдзю вынаходніцтва фатаграфіі, выступілі Нацыянальны гістарычны музей, пасольства Францыі ў Беларусі, музей Ньепса і беларускае грамадскае аб'яднанне "Фотамастацтва". Паралельна з экспазіцыяй дэманстраваліся французскія дакументальныя фільмы аб мастацтве фотаздымкаў у канферэнц-зале Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С.Пушкіна. Пасля экспанавання ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь выстаўка перамясцілася ў Гомель, у будынак мастацкай галерэі Г.Х.Вашчанкі, дзе паўстала перад наведвальнікамі з 4 па 17 лістапада 2009 г. З 20 лістапада па 8 снежня 2009 г. – у мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

У экспазіцыі было прадстаўлена 86 высакаякасных копій здымкаў Бенядыкта Тышкевіча, зробленых у Лагойску і Мантоне. Тышкевіч таксама здымаў у Вялаве і Заходняй Еўропе. Яго фотаздымкі – гэта працяг захаплення мастацтвам. З аднаго боку, работы здаюцца знарочыстымі, а з другога – некалькі іранічнымі. Часам аб'ектамі для здымкі выступалі сам граф і яго сям'я, пераапранутыя ў сялянскія касцюмы. Для нас гэтыя фотаздымкі цікавыя перш за ўсё з боку этнаграфіі: касцюмы, атрыбутыка таго часу.

Цікавай старонкай культуратворчай дзейнасці Бенядыкта было сяброўства з Міхалам Эльвірам Андрыёлі, беларускім жывапісцам, удзельнікам паўстання 1863–1864 гг. у Літве і ў Беларусі. Італьянец па паходжанні (яго бацька, капітан арміі Напалеона, у 1812 г. трапіў у палон і знаходзіўся ў зняволенні ў Рызе; пазней жаніўся на шляхцянцы Гаснеўскай і назаўсёды застаўся ў Вільні), Міхал праявіў нястрымную цікавасць да гісторыі і культуры Вялікага Княства Літоўскага і імкнуўся мовай мастацтва расказаць пра гераічнае мінулае людзям. Ім створаны цыкл малюнкаў, прысвечаны паўстанню 1863 г.: "Выступленне паўстанцаў",

“Смерць Людовіка Нарбута каля Дубічаў” і інш. Мастак занатаваў рэальныя вобразы паўстанцаў. Па просьбе Уладзіслава Міцкевіча (сына славутага паэта) Міхал Андрыёлі праілюстраваў кнігу Генрыха Жавускага “Успаміны Сапліцы”, дзе паўстае Беларусь XVIII ст. з яе бытам, звычаямі і традыцыямі [1, с. 119]. На жыццёвым шляху Міхала Андрыёлі былі трыумф, слава, ссылка, расчараванне. У апошнія гады яго агарнула меланхолія, узнікалі думкі пра самагубства. “Цяпер раблю высілкі, – пісаў Андрыёлі, – намагаюся рухацца, б’юся і штохвілінна падаю, прыгнечаны, бяссільны, здраджаны, разбіты” [2, с. 45]. У гэты перыяд духоўнай дэпрэсіі на дапамогу славутаму мастаку прыходзіць граф Бенядыкт Тышкевіч, аматар мастацтва і калекцыянер. Ведаючы майстэрства Міхала Андрыёлі ў галіне графікі, Б.Тышкевіч пераконвае мастака ўзяцца за ілюстраванне паэмы А.Міцкевіча “Пан Тадэвуш”. Творца апантана працаваў над гэтым творам на працягу сямі тыдняў. Ён змясціў на малюнку 64 постаці, у іх позах і выразах твараў перадаў настрой і пачуцці, выкліканыя чароўнай ігрой цымбаліста Янкеля. Карціна “Канцэрт над канцэртамі” выклікала захапленне грамадскасці. Тагачасныя крытыкі пісалі, што даўно варшавяне не мелі магчымасці бачыць такой мастацкай працы.

Сяброўства з Бенядыктам Тышкевічам было шчырым. Славутыя знаўцы мастацтва, блізкія па духу, яны любілі сваю Радзіму, імкнуліся сродкамі мастацтва перадаць яе непаўторнае хараство. У гэты перыяд Андрыёлі акрыяў душой, працаваў плённа і апантана. За кароткі час ім напісаны партрэты Міцкевіча, Касцюшкі і Крашэўскага, Снядзецкага і іншых знакамітых асоб. У Міхала Андрыёлі нават зноў абудзіўся дух вандроўніка. Ён наведаў Пецярбург, Ноўгарад. У 1892 г. М.Андрыёлі і Б.Тышкевіч два месяцы вандравалі па Ковеншчыне, якая была так блізка іх сэрцу. Гэта было апошняе наведванне родных і любімых мясцін, але вобразы Айчыны назаўсёды засталіся ў мастацкіх палот-

нах М.Андрыёлі і па-майстэрску зробленых Б.Тышкевічам фотаздымках.

---

*1. Дробаў, Л.Н.* Андрыёлі Міхал Эльвіры / Л.Н.Дробаў, Г.В.Кісялёў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 1. А-Беліца / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: М.В.Біч [і інш.]; прад. М.Ткачова; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 119–120.

*2. Чаропка, В.* Жыццё і незвычайныя прыгоды “Андрыёлі з Вільні” / В.Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 5. – С. 33–47.